**9. Знешнеэканамічныя сувязі.** Брэсцкая вобласць экспартуе малочную, мясную і рыбную прадукцыю, мэблю, газавыя і электрычныя пліты, алей рапсавы.

**Падвядзём вынікі.** Брэсцкая вобласць займае выгаднае геаграфічнае становішча на паўднёвым захадзе краіны. Асноўныя галіны прамысловасці — харчовая і машынабудаванне. Брэсцкая вобласць спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, збожжавай гаспадарцы і вырошчванні буракоў.

***Праверце сябе.*** 1. Назавіце асаблівасці геаграфічнага становішча вобласці. 2. У чым асаблівасць рассялення насельніцтва ў вобласці і чаму? 3. Якая спецыялізацыя прамысловасці Брэсцкай вобласці?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Як будзе змяняцца спецыялізацыя сельскай гаспадаркі вобласці ў сувязі з пацяпленнем клімату? 2. Якія новыя галіны прамысловасці найбольш перспектыўныя ў вобласці?

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Складзіце калаж з этыкетак прадукцыі, якая з'яўляецца брэндам вобласці. 2. Падрыхтуйце паведамленні або мультымедыйныя прэзентацыі пра гарады вобласці.

## § 45. Віцебская вобласць

***Успомніце.*** *З чым звязаны асаблівасці прыродных умоў і прыродных рэсурсаў Віцебскай вобласці?*

**1. Роля вобласці ў гаспадарцы краіны.** Па велічыні валавога рэгіянальнага прадукту Віцебская вобласць пераўзыходзіць толькі Магілёўскую. Удзельная вага ВРП складае 9,1 % ад рэспубліканскага. Віцебская вобласць па ўдзельнай вазе ў агульнарэспубліканскім аб'ёме прамысловай вытворчасці знаходзіцца на чацвёртым месцы, а па вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі — на пятым (мал. 145).

Па карце атласа (с. 75) вызначце ўдзельную вагу вобласці ў колькасці насельніцтва Беларусі.

**2. Геаграфічнае становішча.** Віцебская вобласць займае паўночную частку Беларусі на мяжы з Літвой, Латвіяй і Расіяй. Тут знаходзіцца самы паўночны пункт краіны. Плошча вобласці — 40,1 тыс. км$^2$ (трэцяе месца пасля Гомельскай і Мінскай). Тэрыторыю вобласці перасякаюць транс'еўрапейскія транспартныя калідоры, магістральныя нафтаправоды і нафтапрадуктаправоды, даволі шмат памежных пераходаў і лагістычных

цэнтраў. Усё гэта падкрэслівае выгаднасць эканоміка-геаграфічнага становішча вобласці.

**3. Прыродныя рэсурсы.** У вобласці мала карысных выкапняў. Распрацоўваюцца радовішчы цагельных і цэментных глін, будаўнічага пяску, пясчана-жвіровых сумесей. Каля Віцебска распрацоўваецца радовішча даламітаў «Руба». У азёрах утварыліся радовішчы сапрапеляў, на месцы былых азёр — торфу.

Да якіх адкладаў прымеркавана радовішча даламітаў?

Сельскагаспадарчыя землі займаюць крыху больш за 33 % тэрыторыі — адзін з найменшых паказчыкаў у краіне. Для вобласці характэрнае максімальнае ў Беларусі распаўсюджанне дзярнова-падзолістых забалочаных глеб (больш за 50 %). У Віцебскай вобласці самы кароткі вегетацыйны перыяд, прахалоднае вільготнае лета, халодная і працяглая зіма, што стрымлівае сельскагаспадарчую вытворчасць.

Віцебская вобласць — адна з самых забяспечаных воднымі рэсурсамі. Большую яе частку займае басейн ракі Заходняя Дзвіна. Галоўная рыса вобласці ў наяўнасці на ўсёй тэрыторыі буйных азёр ледавіковага паходжання. У многіх месцах азёры ўтвараюць групы: Браслаўскую, Ушацкую і інш.

Знайдзіце на карце атласа (с. 74) рэкі, якія адносяцца да катэгорыі вялікіх, азёры з плошчай воднага люстэрка больш за 20 $км^2$ і глыбінёй больш за 40 м.

Віцебская вобласць багатая на лясныя рэсурсы. Лясістасць перавышае сярэднюю па краіне і складае 41,9 % (другое месца пасля Гомельскай вобласці). Лясы размяшчаюцца нераўнамерна. Сярод балот шмат верхавых і пераходных. У апошнія гады адзначаецца зарастанне лугоў дрэвава-хмызняковай расліннасцю. Прыродаахоўныя тэрыторыі займаюць 10,2 % плошчы вобласці.

У Віцебскай вобласці знаходзяцца НП «Браслаўскія азёры», большая частка Бярэзінскага біясфернага запаведніка і частка НП «Нарачанскі», 25 заказнікаў і каля 90 помнікаў прыроды рэспубліканскага значэння, вялікая колькасць заказнікаў і помнікаў прыроды мясцовага значэння.

**4. Насельніцтва.** Колькасць насельніцтва вобласці складае 1081,9 тыс. чалавек (пятае месца). У гарадах пражывае 78,9 % насельніцтва. Шчыльнасць насельніцтва — самая нізкая ў Беларусі (27 чал./$км^2$). У вобласці даволі вялікая доля рускіх (каля 12 %).




Мал. 149. Структура ВРП Віцебскай вобласці, 2023 г., %

**5. Прамысловасць.** На долю прамысловасці прыпадае 28,9 % ВРП Віцебскай вобласці (мал. 149). У вобласці працуе звыш 1300 прадпрыемстваў. Больш за 80 % прамысловай прадукцыі даюць Віцебск, Навапалацк, *Орша*.

Вядучае месца ў структуры апрацоўчай прамысловасці Віцебскай вобласці займае вытворчасць нафтапрадуктаў і хімічная прамысловасць. Навапалацкі НПЗ «Нафтан» выпрабляе больш за палову прамысловай прадукцыі вобласці.

Віцебская вобласць — адзіны вытворца поліэтылену, шкловалакна, вапнавай і даламітавай мукі. У вобласці выпускаюць хімічныя валокны і ніткі, пластмасавыя трубы.

Назавіце прадпрыемствы, якія выпрабляюць дадзеную прадукцыю. У якіх гарадах яны знаходзяцца?

Вытворчасць харчовых прадуктаў складае каля 20 % апрацоўчай прамысловасці вобласці — гэта мясная і малочная прадукцыя, а таксама малочна-кансервавая прадукцыя. Машынабудаўнічыя прадпрыемствы выпускаюць больш за палову металарэзных станкоў, тэлевізары. У Віцебску выпрабляецца больш за 90 % дываноў, амаль 50 % абутку Беларусі. У вобласці шмат ільнозаводаў і адзіны ў краіне льнокамбінат у Оршы.

Пакажыце на карце атласа (с. 75) цэнтры апрацоўчай прамысловасці Віцебскай вобласці.

У Віцебскай вобласці выпрабляецца каля 30 % электраэнергіі краіны. Тут знаходзяцца Лукомская ДРЭС — самая магутная ў краіне, Беларуская ДРЭС — першая ў краіне. Ва ўсіх буйных гарадах ёсць ЦЭЦ. Даволі шмат ГЭС, у тым ліку найбуйнейшыя ў краіне Віцебская і Полацкая. Горназдабыўная прамысловасць прадстаўлена прадпрыемствамі па здабычы торфу, будаўнічых матэрыялаў, даламітаў.

**6. Структура і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі.** У структуры ВРП вобласці на долю сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі прыпадае 9,7 %. Вобласць спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, кормавытворчасці ў спалучэнні са збожжавай гаспадаркай, развітым ільнаводствам. У структуры пасяўных плошчаў па 45 % займаюць збожжавыя і кармавыя культуры. Сярод збожжавых вялікая доля ячменю і жыта. Тут найбольш спрыяльныя глебава-кліматычныя ўмовы для вырошчвання лёну і рапсу. Па вытворчасці льновалакна вобласць апярэджвае іншыя рэгіёны — 22 % прадукцыі. Па валавой вытворчасці мяса знаходзіцца на чацвёртым месцы. Развіта птушкагадоўля.

**7. Геаграфія сферы паслуг.** На долю галін няматэрыяльнай вытворчасці ў Віцебскай вобласці прыпадае 50,2 % ВРП. Па працягласці чыгунак (больш за 1200 км) і аўтамабільных дарог вобласць займае адно з першых месцаў у краіне, аднак па грузаабароце і аказанні транспартных паслуг — адно з апошніх. У грузаабароце вялікая роля трубаправоднага транспарту. Вядучым па аб'ёме ВРП выступае гандаль.

Даволі шмат аб'ектаў сацыяльна-культурнай сферы: пяць устаноў вышэйшай адукацыі, амаль 30 каледжаў і ліцэяў, шмат музеяў (лідзіруючае становішча ў краіне), фізкультурна-спартыўных збудаванняў. Асабліва вялікі рэкрэацыйны патэнцыял вобласці.

Вядомыя помнікі архітэктуры Віцебскай вобласці: Сафійскі сабор і Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр у Полацку (мал. 150), ратуша і Палац губернатара ў Віцебску, касцёл Святой Ганны ў вёсцы Мосар, царква Раства Багародзіцы і Траецкі касцёл у Глыбокім і інш.



*а*



*б*

Мал. 150. Помнікі архітэктуры Віцебскай вобласці:
*а* — Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр у Полацку; *б* — Палац губернатара ў Віцебску

У вобласці развіты паляўнічы, спартыўны, аграэкалагічны, кулінарны і культурна-пазнавальны турызм, функцыянуе шмат санаторна-курортных, аздараўленчых арганізацый.

Прааналізуйце карты атласа (с. 61–71) і знайдзіце аб'екты сферы паслуг.

**8. Найбуйнейшыя эканамічныя цэнтры вобласці.** **Віцебск** — адзін з самых старажытных гарадоў Беларусі (заснаваны ў 974 г.). Размешчаны на рацэ Заходняя Дзвіна. Па колькасці насельніцтва (каля 360 тыс. жыхароў) займае трэцяе месца ў краіне. З'яўляецца шматфункцыянальным цэнтрам. Найбольшую ўдзельную вагу ў структуры прадукцыі мае вытворчасць дываноў, абутку, тэлевізараў. Выпускаюцца валакніста-аптычныя кабелі, лекі і іншая прадукцыя. Функцыянуе свабодная эканамічная зона «Віцебск».

Якая яшчэ прадукцыя выпрацоўваецца ў Віцебску?

Віцебск часта называюць культурнай сталіцай Беларусі. Тут працуе філармонія, два тэатры, у тым ліку адзін з найстарэйшых у краіне — Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа. Сусветную вядомасць атрымаў Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

Другі па велічыні горад вобласці — **Орша** (103 тыс. жыхароў). Гэты старажытны горад (заснаваны ў 1067 г.) мае вялікае транспартнае значэнне, бо ляжыць на скрыжаванні чыгунак і аўтамабільных дарог. Шырока вядомая прадукцыя аршанскіх прадпрыемстваў машынабудавання, лёгкай і харчовай прамысловасці: металаапрацоўчыя станкі, ільняныя тканіны, мясныя кансервы, кансервы для дзіцячага харчавання, сыры.

Колькі напрамкаў чыгунак мае Аршанскі чыгуначны вузел?

У Аршанскім раёне размешчаны г. п. Копысь — месца нараджэння першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі.

**Наваполацк** (95 тыс. жыхароў) заснаваны ў 1958 г. недалёка ад Полацка ў сувязі з будаўніцтвам нафтаперапрацоўчага завода «Нафтан». Асноўная яго прадукцыя — нафтапрадукты, хімічныя валокны і інш. У маладым горадзе развіта сфера паслуг. На базе політэхнічнага інстытута ў 1993 г. заснаваны Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай.

**9. Знешнээканамічныя сувязі.** Сярод найважнейшых відаў экспартнай прадукцыі Віцебскай вобласці — нафтапрадукты, правады і кабелі, малочная і мясная прадукцыя, тэлевізары, палімеры этылену, шкловалакно і вырабы з яго, абутак, алей рапсавы.

**Падвядзём вынікі.** Віцебская вобласць — адна з самых забяспечаных воднымі рэсурсамі. Галіны спецыялізацыі: нафтаперапрацоўка і хімічная прамысловасць, вытворчасць электраэнергіі, ільняных тканін і дываноў. Віцебская вобласць мае высокі рэкрэацыйны патэнцыял тэрыторыі.

***Праверце сябе.*** 1. Ахарактарызуйце прыродныя рэсурсы Віцебскай вобласці. 2. Назавіце галіны спецыялізацыі прамысловасці вобласці.

***Праблемныя пытанні.*** 1. Якія фактары абумовілі ўзнікненне самых старых і самых маладых гарадоў вобласці? 2. Вызначце ўзаемасувязь паміж прыродна-кліматычнымі ўмовамі і спецыялізацыяй сельскай гаспадаркі вобласці.

***Ад тэорыі да практыкі.*** З выкарыстаннем дадатковага матэрыялу складзіце геаграфічны партрэт вобласці, вылучыце асноўныя прыродныя, сацыяльныя і эканамічныя характарыстыкі тэрыторыі.

## § 46. Гомельская вобласць

***Успомніце.*** *Які рэгіён Беларусі з'яўляецца найбагацейшым на карысныя выкапні? Якая тэрыторыя найбольш пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС?*

**1. Роля вобласці ў гаспадарцы краіны.** Па ўдзельнай вазе валавога рэгіянальнага прадукту ў ВУП краіны (11,8 %) Гомельская вобласць саступае толькі Мінску і Мінскай вобласці. Па ўдзельнай вазе ў агульнарэспубліканскім аб'ёме прамысловай вытворчасці знаходзіцца на другім месцы, а па вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі — на чацвёртым (мал. 145).

Па карце атласа (с. 77) вызначце ўдзельную вагу вобласці ў колькасці насельніцтва Беларусі.

**2. Геаграфічнае становішча вобласці.** Гомельская вобласць размяшчаецца на паўднёвым усходзе Беларусі і мяжуе з Расіяй і Украінай. Частка тэрыторыі пасля аварыі на ЧАЭС апынулася ў межах зоны адчужэння. У вобласці знаходзіцца самы паўднёвы пункт краіны. Вобласць самая буйная ў краіне па плошчы — 40,4 тыс. км$^2$.